УДК 81’42

# АКТУАЛЬНАСЦЬ СЕМАНТЫКА-СТЫЛІСТЫЧНАГА ВЫВУЧЭННЯ АКАЗІЯНАЛІЗМАЎ

**М. А. Самсонава**
(Установа адукацыі «Магілёўскі дзяржаўны ўніверсітэт імя А. А. Куляшова», кафедра агульнага і славянскага мовазнаўства)

*У артыкуле вызначаецца роля аказіяналізмаў як экспрэсіўнай адзінкі мовы, указваецца іх здольнасць ўплываць на фарміраванне індывідуальнага аўтарскага стылю, сцвярджаецца неабходнасць семантыка-стылістычнага аналізу наватвораў.*

Важнай задачай сучаснай лінгвістыкі з’яўляецца вызначэнне спецыфікі экспрэсіўнасці ў лінгвакультуры XXI ст. Экспрэсіўнасць тэксту дазваляе ўздзейнічаць на рэцыпіента, адлюстроўвае асаблівасці свядомасці адрасанта. У сучаснай сітуацыі развіцця грамадства значэнне экспрэсіўнасці як лінгвакультуралагічнай катэгорыі складана пераацаніць. Навукоўцы адзначаюць шматпланавасць і скла-



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

данасць феномену экспрэсіўнасці. З'ява экспрэсіўнасці моўных адзінак розных узроўняў непасрэдна вынікае з чалавечага быцця і свядомасці; без яе наша гаворка была б манатоннай і аднастайнай.

Мастацкае маўленне заўсёды экспрэсіўна афарбаванае, бо імкнецца да выразнага адлюстравання эмацыйнага стану ці настрою персанажа або лірычнага героя, яго ўнутранай самадастатковасці або незадаволенасці, адабрэння або адмаўлення таго, што адбываецца. Менавіта ў мастацкіх творах даюцца самыя разнастайныя каштоўнасныя, вобразна-асацыятыўныя, гульнявыя, камічныя характарыстыкі навакольнага свету і самога суб'екта маўлення. Беларуская мова валодае шырокім наборам сродкаў для рэалізацыі маўлення, для рэпрэзентацыі самых розных экспрэсіўных станаў і характарыстык.

Адным з такіх сродкаў з'яўляюцца аказіянальныя словы. Вывучэнне рознага роду парушэнняў і адхіленняў ад вядомых нам заканамернасцяў функцыянавання мовы, прыкладам якіх, несумненна, з'яўляюцца аказіяналізмы (наватворы, патэнцыйныя словы, славаўтваральныя анамаліі і інш.), дазваляе не толькі глыбей зразумець прыроду самога аб'екта і ацаніць узровень ведаў пра яго, але і асэнсаваць славаўтваральныя магчымасці нацыянальнай мовы, дадатковыя спосабы імпліцытнага выражэння інфармацыі, атрымаць уяўленне аб сэнсава-экспрэсіўнай насычанасці слова і яго здольнасці змяшчаць максімум інфармацыі ў мінімальным аб'ёме.

Як адзначае А. А. Земская, «аказіяналізмы характарызуюць зусім асобы аспект вывучэння мовы – творчы, індывідуальны, эстэтычны: яны рэалізуюць індывідуальную творчую кампетэнцыю таго, хто гаворыць, хай гэта паэт, дзіця або звычайны чалавек. Яны арыентаваны не на правілы, агульныя для ўсіх носьбітаў мовы, а на здольнасці індывідуума выкарыстоўваць магчымасці, закладзеныя ў сістэме мовы. Аказіяналізмы паказваюць, на што здольная мова пры параджэнні новых слоў, якія яе творчыя патэнцыі, глыбінныя сілы» [1, с. 180].

Творчае змяненне ўжо існуючага слова або стварэнне новага на ўзор характэрных для пэўнай мовы мадэляў зусім не гаворыць пра тое, што аўтару не хапае слоў – наадварот, сцвярджае яго імкненне перадаць самыя тонкія адценні думак і пачуццяў, самыя дробныя дэталі асобных прадметаў або рэчаіснасці, а ў сукупнасці – сваё, непаўторнае адчуванне і ўспрыняцце жыцця.

Аказіяналізмы надаюць тэксту выразнасць, яркую вобразнасць, прымушаюць пераасэнсаваць раней вядомае, ствараючы тым самым той непаўторны каларыт мовы, які адрознівае сапраўдных майстроў слова: «Адступленне ад прынятай нормы ў плане больш свабоднага стылю, большай аўтарскай індывідуалізацыі ў значнай ступені ўласціва вядомым мастакам слова і сведчыць аб творчым пачатку асобы» [2, с. 97].

У апошнія гады ў лінгвістыцы ўзмацнілася ўвага да антрапацэнтрычнага боку мовы. Актыўна вывучаюцца магчымасці творчага індывідуальнага выкарыстання моўнага матэрыялу для ўдасканалення якасці зносін, павышэння іх выразнасці. Антрапацэнтрычныя па сваёй прыродзе аказіяналізмы варта лічыць важным сродкам экспрэсівізацыі тэксту, паколькі яны спрыяюць псіхалагізацыі маўлення, робяць яго жывым, натуральным, непасрэдным, адлюстроўваючы самыя тонкія і глыбокія пачуцці чалавека.

У паэзіі значна часцей, чым у іншых сферах функцыянавання аказіянальных слоў, можна сустрэць наватворы з унікальнай структурай, створаныя спецыяльна з устаноўкай на слоўную гульню, каламбур. Такія ўнікальныя, спецыфічныя для мастацкай мовы наватворы, тым не менш, можна тыпізаваць па спосабе славаўтварэння. Не выклікае сумненняў, што аказіяналізмы, створаныя спецыфічнымі спосабамі, – гэта рэзерв экспрэсіўнасці. Іх экспрэсіўнасць – у нечаканасці, у эфекце нараджэння складанага мастацкага вобраза. Уласна аказіянальныя наватворы з'яўляюцца свядомым тварэннем мастакоў слова, і таму заўсёды нясуць на сабе вялікую эмацыйна-сэнсавую нагрузку.

Славаўтваральныя магчымасці аказіяналізмаў уплываюць на якасць ажыццяўлення зносін, спрыяюць наладжванню (або, наадварот, разладжванню) кантактаў паміж суразмоўцамі, узнікненню паразуменняў (або, наадварот, непаразуменняў) паміж аўтарам і чытачом. Важнай у гэтых адносінах уяўляецца так званая маскіровачная функцыя маўленчых інавацый, паколькі яны часта дазваляюць абысці вострыя вуглы, культурныя забароны, цэнзуру, пэўным чынам замаскіраваць паведамленне. Маўленчыя неалагізмы нярэдка замацоўваюцца ў мове і як новы, больш эканамічны спосаб выказвання думкі (функцыя эканоміі часу і моўных сродкаў). Іх семантычная ёмістасць дазваляе лаканічна назваць аб'ект, не звяртаючыся да апісальных канструкцый. Аказіяналізмы выконваюць і эстэтычную функцыю, што асабліва прыкметна пры іх уключэнні ў мастацкі твор.

Нягледзячы на значную колькасць работ, прысвечаных пытанням вывучэння аказіяналізмаў, аказіянальнае слова яшчэ да гэтага часу недастаткова даследавана як з'ява, якая адлюстроўвае дынаміку мовы, яе форма- і славаўтваральны патэнцыял. Нават пры такім багацці навуковых прац цікавасць да вывучэння аказіянальнай лексікі не слабее, а, наадварот, з кожным днём расце. Гэта абумоўлена тым, што ў даследаваннях гэтага пытання нельга паставіць кропку, таму што ўтварэнне аказіяналізмаў – бесперапынны працэс, які патрабуе пастаяннай увагі і вывучэння. Часам ён запавольваецца, часам паскараецца, але ніколі не спыняецца. Новым уяўляецца зварот да семантыка-

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

стылістычнага аналізу індывідуальна ўтвораных адзінак. Пастаянна ўзнікаюць новыя лексемы, якія маюць патрэбу ў рознабаковым апісанні.

**Літаратура**

1. Земская, Е. А. Словообразование как деятельность / Е. А. Земская. – М. : Наука, 1992. – 221 с.

2. Шаршнёва, В. М. Праблема індывідуальнага стылю пісьменніка ў лінгвістычнай літаратуры / В. М. Шаршнёва // Куляшоўскія чытанні : сборник научных статей по материалам Международной научно-практической конференции, 18–19 апреля 2019 г. / под ред. Т. В. Мосейчук. – Могилев : МГУ имени А. А. Кулешова, 2020. – С. 96–100.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова